

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№43 (176). 19 — 25 кастрычніка 2000г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 100 руб.

“Верните наши ДЕНЬГИ!”

Рабочий столярного цеха МП "Саланг" Эдуард Маркевич пришёл в редакцию "ГС" и поведал про свою беду. Их коллективу (9 человек) вот уже с мая месяца по сегодняшний день не выплатили зарплату, не выдали также детское пособие.

"Мы обращались в республиканский госконтроль, где нам пообещали во всем разобраться. Где-то 12 сентября мы вновь перезвонили. Нам ответили, что наш вопрос еще рассматривается в инстанциях", — рассказывает Эдуард Станиславович.

Однако зарплаты люди так и не получили. "Поэтому мы обратились в слонимскую прокуратуру, как в ведомство, которое ведёт надзор за выполнением законов. Проверяли фирму и работники ОБЭП Слонимской милиции. Но никаких финансовых нарушений не нашли. Мы по сегодняшний день не можем понять, куда девались наши заработанные деньги? Ответ на этот вопрос вот уже который месяц, нам никто не может дать. А ведь действует декрет президента Лукашенко о своевременной выдаче зарплаты. В одно время даже определенные госструктуры держали на особом контроле выплату заработанных денег на предприятиях. Так что, у нас в Слониме президентские распоряжения не действуют?", — спрашивает Эдуард Станиславович Маркевич.

А ведь люди требуют всего лишь вернуть им ими же заработанные деньги.

Ольга ШИНКЕВИЧ

Ці не станем мы ўсе ЖАБРАКАМІ?



Фота Віталя Гіля

Для гэтай жанчыны і лаўка ў слонімскім скверы — добры ложак

(Матэрыял чытайце на стр. 2)

З ДВУХ ВЫБЕРУЦЬ АДНАГО

Па дадзеных Слонімскай выбарчай камісіі, выбары дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Беларусі ў нас адбыліся. У галасаванні прынялі ўдзел 39066 чалавек альбо 65,1% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Аднак хто будзе прадстаўляць Слонімшчыну ў парламенце, канчаткова стане вядома па выніках галасавання другога тура, які адбудзецца 29 кастрычніка. З шасці кандыдатаў у дэпутаты большую колькасць галасоў набралі Станіслаў Здановіч (за — 16860, супраць — 20921) і Сяргей Мудроў (за — 5292, супраць — 32489). Менавіта яны і будуць змагацца за дэпутацкі мандат у другім туры. Астатнія кандыдаты маюць наступныя вынікі галасавання: Віктар Герасімчык: за — 3425, супраць — 34356; Аляксандр Кірычэнка: за — 1402, супраць — 36379; Валерый Рэут: за — 4994, супраць — 32787; Уладзімір Чухно: за — 326, супраць — 37455).

Паводле дадзеных Цэнтральнай выбарчай камісіі, выбары адбыліся ў 96-ці са 110-ці выбарчых акругаў Беларусі. У 43-х акругах ужо абраныя новыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія перамаглі адразу ў першым туры. У астатніх галасаванне пройдзе праз два тыдні.

Сярод тых 43-х асобаў, што былі абраныя ўжо ў першым туры — 8 прадстаўнікоў палітычных партый. Дэпутатамі сталі толькі тры жанчыны. Але самае адметнае, што сярод іх больш як палова — 22 чалавекі — дэпутаты цяперашняга складу Нацыянальнага сходу. Назавем толькі некаторыя найбольш вядомыя прозвішчы — Кучынскі, Пашкевіч, Хрол, Ананьеў, Глухоўскі, Салаўёў, Малафееў, Канаплёў, Худая, Катляроў, Дубовік.

Нейкім загадкавым чынам выбары ў Мінску не адбыліся менавіта толькі ў тых трох акругах, у якіх на дэпутацкі мандат прэтэндавалі лідэры апазіцыйных партый — Мікола Статкевіч, Сяргей Калякін і Сяргей Гайдукевіч.

Анатоль МІРСКІ, Віталь ЦЫГАНКОЎ



Фота Віталя Гіля

Так праходзілі выбары на Маладзёжным участку №20, які знаходзіўся ў клубе Слонімскага кардонна-папяровага завода

Адкуль лічбы?

У рэдакцыю "ГС" звярнуўся афіцэр Слонімскай брыгады маёр Мікалай Гарматны. Яго і іншых вайскоўцаў, якія жывуць на вуліцы Касаўскі тракт, хвалюе пытанне аплаты за "падагрэў вады".

Справа ў тым, што, у адпаведнасці з рашэннем гарвыканкама, гарачай вады ў жыхароў Энкі не было з 19 чэрвеня да 10 ліпеня. Пасля гарвыканкам працягнуў гэты тэрмін да 17 ліпеня. А па словах Гарматнага, гарачай вады не было аж да 26-га ліпеня! Атрымоўваецца, што дзевяць дзён гараджане заставаліся без гарачай вады невядома па чыёй волі.

Цікавае пачалося пасля, калі людзям прыйшлі квіткі на аплату за "падагрэў вады". Напрыклад, Мікалай Гарматны за чэрвень заплаціў 699 рублёў, за ліпень 706 рублёў, а за жнівень толькі 349 рублёў. І гэта ўлічваючы, што ў чэрвені-ліпені па паўмесяца не было гарачай вады, а восьу жніўні яна была...

Адкуль з'явіліся такія лічбы? Спрабавалі вайскоўцы даведацца пра гэта ў работнікаў гарадской камунальнай службы, але пакуль безвынікова. І справа тут нават не ў грошах, лічыць Мікалай Гарматны, а ў жаданні даведацца: кім і па якому прынцыпу налічваецца аплата за камунальныя паслугі?

Сяргей ЁРШ

ЗАТРЫМАЛІ ГАНДЛЯРА ЎЗРЫЎЧАТКАЙ

У Слонімскім аддзяленні УКДБ карэспандэнту "ГС" пацвердзілі факт затрымання мужчыны, які спрабаваў прадаць выбуховае рэчыва.

Здарылася гэта 11 кастрычніка. У той момант, калі адбывалася здзелка, гандляра і схапілі за рукі. У яго было канфіскавана 3,5 кілаграма тэтрылу. А на месцы жыхарства слонімца было знойдзена яшчэ 200 грамаў выбуховага рэчыва. Дарэчы, тэтрыл з'яўляецца ўзрыўчаткай моцнай разбуральнай сілы. Напрыклад, 3,7 кілаграма яго хапіла б, каб узарваць шматпавярховы будынак.

Супраць слонімца, які гандляваў тэтрылам, узбуджана крымінальная справа.

Сяргей ЧЫГРЫН

О парламенте и кандидатах В ДЕПУТАТЫ



(ЧЫТАЙЦЕ НА СТР. 2)

«Яму не падабаецца, што мы друкуемся ў «Газеце Слонімскай»...

(ЧЫТАЙЦЕ НА СТР. 3)

КАСЦЮМЧЫК НА СМЕРЦЬ

(ЧЫТАЙЦЕ НА СТР. 3)

Астралагічная КАРТА Слонімшчыны



(ЧЫТАЙЦЕ НА СТР. 8)

ДАТА

Ці не станем мы ўсе жабракамі?





Фота Віталя Гіля

Нашы беларускія жанчынкі. Ці заслужылі яны гэткую долю?

Выпадкова ў сваім настольным календары вычытаў, што 17 кастрычніка лічыцца днём барацьбы за ліквідацыю жабрацтва. Раней пра такую дату я і не ведаў. Таму пазваніў у аддзел сацыяльнай дапамогі Слонімскага гарвыканкама і запытаўся, ці ведаюць там пра ўзгаданы дзень?

— Не, не ведаю, — сказала загадчыца аддзела Кацярына Руткоўская. — Мы адзначаем дзень пажылых людзей, дзень маці і іншыя, а пра гэты чую ад вас упершыню, — здзівілася Кацярына Янаўна.

Аказваецца, дзень барацьбы за ліквідацыю жабрацтва абвясціла Генеральная Асамблея ААН. Правядзенне такога дня павінна садзейнічаць разуменню грамадствам праблем беднасці і ўсведамленню людзьмі неабходнасці барацьбы з ёй, асабліва ў тых краінах, якія сталі на шлях развіцця. Да такіх краін можна аднесці і Беларусь, дзе праблема жабрацтва застаецца адной з самых вострых.

Як мне паведамілі ў аддзеле сацыяльнай абароны, сёння толькі ў нашым горадзе пражывае каля 80% малазабяспечаных. За дзевяць месяцаў на сацыяльныя патрэбы маламаёмасных слонімцаў з мясцовага бюджэту было выдаткавана толькі 2 мільёны рублёў, а з фонду сацыяльнай абароны — 600 тысяч. Акрамя гэтай фінансавай дапамогі, людзей забяспечвалі яшчэ харчамі, адзеннем, абуткам і г. д. Шмат дапамагалі інвалідам вайны і працы.

На вуліцы 17 верасня ў Слоніме існуе дом сацыяльных паслуг, дзе пражываюць шэсць адзінокіх састарэлых. Ён цалкам фінансуецца з мясцовага бюджэту.

Дарэчы, у аддзеле сацыяльнай абароны працуюць у асноўным жанчыны. Яны штодзённа абслугоўваюць адзінокіх нямоглых людзей, дапамагаюць ім дома і па гаспадарцы. А ў гэтых жанчын аклад на сёння — 16 тысяч рублёў. Дык ці не станем мы заўтра ўсе жабракамі?

Сяргей ЧЫГРЫН

Сынковіцкая царква — на памятнай манеце

16 кастрычніка Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарот памятныя манеты серыі "Помнікі архітэктуры Беларусі" — Сынковіцкая царква.

На манеце змешчана выява царквы-крэпасці XV–XVI стагоддзяў, якая знаходзіцца ў вёсцы Сынковічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Манеты прадстаўлены ў двух выкананнях: адзін варыянт — са срэбра 925-й пробы вартасцю 20 рублёў і масай каштоўнага металу — 31,1 грама, дыяметр — 38,61 міліметра; другі — з медна-нікелевага сплаву вартасцю адзін рубель, дыяметрам 32 міліметры.

Памятныя манеты можна набыць у Галоўных упраўленнях і аддзяленнях Нацыянальнага банка.

Аляксей АРЭШКА

БТ становіцца рускамоўным

Мусіць, кардынальныя змены адбываюцца на беларускім тэлебачанні апошнім часам. Усё больш і больш з'яўляецца ў эфіры рускамоўных перадач.

Спачатку рускамоўнымі на нацыянальным тэлеканале былі асобныя перадачы. Пасля чарга дайшла да выпускаў навін. Чамусьці, у асноўным, па-руску пачалі асвятляць журналісты БТ жыццё і дзейнасць Аляксандра Лукашэнкі. А вось раніцай у панядзелак, 16 кастрычніка, на наступны дзень пасля выбараў, у эфір выйшаў рускамоўны спецвыпуск навін. Здаецца, такога не было нават у часы савецкай Беларусі...

Яшчэ не забыліся рэпартажы беларускіх журналістаў з Алімпійскіх гульняў у Сіднеі, якія таксама былі агучаны па-руску. Напэўна, кіраўніцтва БТ клапацілася, каб тэлегледачы лепш успрымалі справаздачы пра поспехі нашых спартсменаў. Але ў такім разе, як зразумець, што БТ ніяк не хацела паказваць тэлегледачам другі тайм футбольнага матчу Беларусь — Арменія? Ці прапагандысцкі фільм Азаронка больш актуальны за футбол?..

Беларускую мову работнікі БТ пачалі ўжо забываць. Вось, напрыклад, у перадвыбарчым ролiку прапаноўваўся ўзор бюлетэня для галасавання "Іванова Івана Іваныча". Круцілі гэты ролік каля тыдня. Пасля хтосьці патэлефанаваў тэлевізіёншчыкам і патлумачыў, што трэба пісаць не "Іваныч", а "Іванавіч". Замянілі.

Як гэта не сумна канстатаваць, а нацыянальны тэлеканал становіцца ўсё больш падобны на правінцыйныя расійскія. Больш таго, і так невялікі ягоны рэйтынг у грамадстве катастрафічна падае, нягледзячы на тое, што БТ становіцца ўсё больш рускамоўным. Акрамя таго многім, лічу, ужо надакучылі селектарныя нарады ды хроніка з жыцця аднаго чалавека.

Сяргей ЁРШ

ПРОШУ СЛОВА

О ПАРЛАМЕНТЕ и кандидатах в депутаты

Я, как и многие жители Слонимщины, желаю, чтобы будущий парламент моего государства состоял из высокопрофессиональных депутатов. Также хочу, чтобы будущий парламент по боевитости, по стилю работы был похож хотя бы на такой, как Российская Дума. Ведь необходимо, наконец, чтобы на высоком профессиональном уровне решались экономические, социальные, политические и другие государственные вопросы.

Хорошо или плохо, но в России произошёл бескровный передел собственности. Благодаря этому страна идёт новым курсом политического и экономического развития. Такие исторические преобразования произошли во многих странах бывшего социалистического лагеря, в том числе и в тех, которые входили в состав СССР. На новый путь развития эти страны стали, благодаря работе парламентов. Примером тому может служить работа Госдумы России. Судьбоносные законы принимались и принимаются депутатами с перевесом в несколько десятков или простым большинством голосов.

А текущие события в Югославии показали, что нет уже "вечного президента". В Беларуси же, только благодаря беспринципности и непрофессионализму наших парламентариев, одним человеком "стабильно" и безуспешно строится рыночный социализм, сущность которого непонятна абсолютному большинству граждан. "Успехи" нашей экономики мы видим и реально ощущаем почти ежедневно по потребительским корзинам и оплате "ударного" труда.

Только при полном попустительстве парламента Беларусь сегодня находится в частичной международной изоляции.


К сожалению, наш сегодняшний парламент с завидным 100% постоянством одобряет все Указы и предложения президента страны и правительства. А. Г. Лукашенко с упорством доказывал и доказывает, что согласие в парламенте — это спокойствие в стране. Но так мы уже жили в СССР до конца 80-х годов, так работают парламенты Северной Кореи, Кубы, Ирака, Туркменистана. Единогласие — это мнимое спокойствие, это тоталитарный режим — предвестник, не дай Бог, кровавых событий. Только по причине спокойствия нашего парламента на улицах Минска была пролита, к большому счастью, малая кровь. Именно по этой причине в столице производились аресты сотен людей. Я хотел бы, чтоб эти "битвы" проходили в парламенте страны, и уверен, тогда и на улицах будет спокойно.

В настоящее время отношения России и Беларуси как бы развиваются. Однако они хрупкие и неустойчивые. Об этом почти еженедельно напоминает нам сам А.Г. Лукашенко. Но, по его определению, во всем виновато сегодняшнее руководство России.

Лицом любого народа, в том числе и белорусского, являются парламент, президент, правительство страны. И очень больно и стыдно видеть, что собой представляет лицо Беларуси. А ведь постоянно отмечается, что мы, белорусы, самый толерантный, трудолюбивый, дружелюбный народ в мире. По чьей тогда вине руководство такого народа попадает в неуважение к народам других стран? А восхваление народа президентом и парламентом попахивает откровенной спекуляцией. Новому парламенту необходимо добиться статуса международного и помочь президенту страны занять подобающее место среди руководителей других государств.

Недавно закончился первый тур выборов в парламент. Кто из двух кандидатов победит, определят люди. Поэтому я бы хотел напомнить слонимчанам, что будущее наших детей и внуков сегодня зависит от нас. Я уверен, что дети и внуки не желают жить в светлом коммунистическом (да и не знают они его) и в нашем сегодняшнем социализме. Сейчас сотни наших слонимчан зарабатывают себе на жизнь в других странах. Так неужели мы не способны в родном государстве создать благоприятные условия для нормальной жизни и труда?!

Александр НИЧИПОР, полковник запаса



Фота Віталя Гіля

Люди выбирают. Снимок сделан 15 октября

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі 2-14-39
.........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 18 кастрычніка 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы: 64042 (індывідуальная) 63818 (ведамасная)
Наклад 9500 экз.
Заказ № 3222

ЗДАРЭННІ

Як кралі, так і крадуць...

***

Супрацоўнікі Слонімскага аддзела ўнутраных спраў толькі паспяваюць лавіць злодзеяў.

Так, на вуліцы Сінічкіна непаўнагадовы слонімец хацеў украсці тэлевізар, але не паспеў.

На вуліцы Хлюпіна жанчыназладзейка ўкрала посуд, адзенне і іншыя хатнія рэчы, але міліцыя яе затрымала.

А ў вёсцы Рахавічы злодзей абрабаваў магазін. Ён украў гарэлку, шампанскае і грошы.

Узбуджана крымінальная справа.

Сяргей ЧЫГРЫН

***

У калгасе "Зара" Дзятлаўскага раёна злодзеі ўкралі цялушку вагой 390 кілаграмаў.

Міліцыя хутка выйшла на след злачынцаў. Імі аказаліся жыхары раёна. У той жа дзень са склада калгаса "Войневічы" нехта ўкраў 40 кілаграмаў ільнасемя. А з двара грамадзяніна Р., які працуе трактарыстам у калгасе імя Заслонава, знікла калгасная бульбакапалка.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

***

Ночью ферму СКП "Нива", что расположена в деревне Нарбутовичи Дятловского района, посетили воры.

Неизвестным преступникам удалось похитить двух телят общим весом 625 кг, оценочной стоимостью в 200 тысяч рублей. И это несмотря на то, что территория фермы охраняется двумя ведомственными сторожами.

В 500-х метрах от фермы сотрудники милиции обнаружили головы похищенных животных. Значит, преступникам удалось не только спокойно вывести двух телят, но и успеть разделать их почти под носом у сторожей.

"МВ"

Исчезновение Завадского было ЧАСТЬЮ СПЕЦОПЕРАЦИИ?

15 октября исполнилось 100 дней со времени исчезновения оператора ОРТ Дмитрия Завадского.

По словам его супруги Светланы, после передачи "Жди меня", показанной недавно по ОРТ, на телевидение позвонил неизвестный и сообщил о том, что Завадского после похищения доставили в Витебский следственный изолятор, где держали 3 дня, а затем увезли в неизвестном направлении. Ничего более конкретного гражданин не сообщил и не оставил своих координат.

В интервью корреспонденту БелаПАН руководитель отдела специальных информационных проектов ОРТ Павел Шеремет сообщил, что подобных звонков поступает достаточно много, но ни один пока не подтвердился.

Расследование по факту исчезновения Завадского проводит Прокуратура Республики Беларусь совместно с МВД и КГБ. Эпизод по исчезновению телеоператора объединен с рядом других преступлений, в частности, убийством азербайджанской семьи весной 2000 года в Минске, убийством руководителя белорусского отделения РНЕ Глеба Самойлова.

"Нас беспокоит ход следствия, — заявил Павел Шеремет. — В МВД возник настоящий переполох, поскольку следователи случайно вышли на факты, позволяющие утверждать, что задержанные по подозрению в похищении Дмитрия Завадского косвенным образом могут быть связаны с Советом безопасности. Арестованы пять бывших сотрудников спецподразделений МВД и еще два действующих сотрудника находятся в розыске. Имеются косвенные доказательства их причастности к похищению Дмитрия". По утверждению тележурналиста, назначение министром внутренних дел бывшего руководителя службы безопасности президента Владимира Наумова связано именно с этими обстоятельствами. Поэтому сейчас имеются опасения, что дело будет "спущено на тормозах", и прокуратура не сможет довести его до конца.



Следствие в последнее время отказывается сотрудничать с Общественным Российским Телевидением. Генеральный директор ОРТ Константин Эрнст обратился с письмом к Александру Лукашенко, но до сих пор ответа не получено. "В последнее время для нас закрыта вся информация, нас активно отталкивают от этого дела. Более того, активно распространяются слухи, что якобы ОРТ причастно к исчезновению Дмитрия".

По мнению Павла Шеремета, вполне возможно, что исчезновение Дмитрия Завадского явилось частью какой-то спецоперации, проводимой в ближайшем окружении белорусского президента. Но это не снимает с руководителя государства вину за пропажу Дмитрия Завадского.

В настоящее время обсуждается вопрос о возбуждении уголовного дела по факту исчезновения Завадского Генеральной прокуратурой Российской Федерации. Это делается для придания большей эффективности проводимому в Беларуси расследованию.

Сейчас Павел Шеремет приступает к монтажу фильма об исчезнувших известных белорусских гражданах. По его словам, все эти дела словно выполнены одним почерком. Похожи и следующие за исчезновениями события вокруг этих преступлений: семьи, друзья пропавших подвергаются давлению, шантажу, дискредитации. "Слухи, что Захаренко, Гончар, Красовский якобы сами могли исчезнуть и живы, на мой взгляд, — бред, провокация, ложь, сознательно распускаемая спецслужбами", — заявил тележурналист. При съемках фильма группа столкнулась с сильным противодействием белорусских властей и даже рядовых граждан. Павла Шеремета поразил эпизод, когда директор средней школы № 128, где учится сын Дмитрия Завадского Юрий и когда-то учился сам телеоператор, запретила съемки в здании школы до разрешения вышестоящего начальства.

Геннадий БАРБАРИЧ

НАВІНЫ

Будзе другі тур

Закончыўся першы тур выбараў у Палату прадстаўнікоў РБ па Мастоўскай выбарчай акрузе № 58.

Выбары адбыліся, але яны прайшлі пры нізкай актыўнасці выбаршчыкаў, адзначалі ў большасці назіральнікі. Ніхто з чатырох кандыдатаў у дэпутаты не атрымаў перавагі, і таму адбудуцца паўторныя выбары. У другі тур выйшлі Генадзь Дылеўскі, дырэктар юрыдычнай фірмы "Уладыка", і Анатоль Фрэйберг, галоўны ўрач Зэльвенскай ТМА.

Касцюмчык на смерць

Цікавы эпізод адбыўся на Галубоўскім выбарчым участку Мастоўскай выбарчай акругі.

Для ўдзелу ў галасаванні з адной з вёсак сюды прывезлі пенсіянераў. Адзін са старых запытаўся ў членаў участковай камісіі: "За каго галасаваць?". Яму паказалі перадвыбарчую праграму кандыдата ў дэпутаты Яўгеніі Грыгарэнка і сказалі: "Галасуй за гэтую жанчыну".

— А што яна мне зробіць?

— Касцюм на смерць пашые.

А паколькі ў вёсцы Галубкі комплексны прыёмны пункт, што адносіўся да камбіната бытавога абслугоўвання, якім кіруе Я. Грыгарэнка, зачынены, чалавек засумняваўся, але людзі ад камісіі горача пераконвалі яго.

— Не хвалюйся, у Мастах касцюм табе пашыюць, — казалі яны.

То дэсантнікі спяваюць, то казакі танчаць

На мінулым тыдні ў Мастоўскім РДК адбыліся два канцэрты артыстаў з Расіі.

Напачатку Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане прадставіў "Песенны марш міру". Сваё майстэрства прадэманстравалі гледачам канцэртны ансамбль паветрана - дэсантных войск Расіі "Блакітныя берэты", які ўзначальвае Сяргей Яравы. На наступны дзень на сцэне дома культуры танчылі кубанскія казакі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

"Круглы стол" дзіцячых арганізацый прайшоў у Гродне

На пачатку кастрычніка ў Гродне праходзіў "круглы стол" на тэму "Узаемадзеянне дзіцячай ініцыятывы на мясцовым узроўні".

Абмяркоўваліся праблемы дзіцячых арганізацый Гродзеншчыны. У прыватнасці, адзначалася, што ўлады клапоцяцца больш пра зарэгістраваныя арганізацыі, чым незарэгістраваныя. Напрыклад, у незарэгістраванага аб'яднання "Вятрак" у вёсцы Мірная Слонімскага раёна былі непаразуменні з адміністрацыяй школы і з намеснікам старшыні райвыканкама Аляксандрам Тарсуновым (яму не падабаецца, што мы друкуемся ў "Газеце Слонімскай", а не ў "Слонімскім весніку").

На пастаўленыя намі пытанні паспрабавалі адказаць Аляксандр Дзікевіч з камітэта па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама і Таццяна Аўдзейчык з аддзела дзіцячых арганізацый абласнога палаца творчасці дзяцей і моладзі. Аляксандр Дзікевіч пабяцаў прыехаць да нас і разабрацца з нашай праблемай.

Алег ШЭЛЕСТАЎ

НАВІНЫ

Штаты райотделов милиции, ВОЗМОЖНО, ВОЗРАСТУТ

Министр внутренних дел Беларуси опроверг слухи о грядущем сокращении милиции.

Генерал-майор милиции Владимир Наумов сделал это заявление в Гродно во время оперативного совещания по итогам работы органов внутренних дел Гродненской области за 9 месяцев текущего года. Он заявил, что сокращение коснется только центрального аппарата МВД.

Штаты же районных отделов милиции, судя по всему, напротив, возрастут. "Я буду делать максимум для того, чтобы там еще увеличить, насколько это будет возможно, количество личного состава", — заявил Наумов. Он также сообщил, что в ближайшие дни на места придут предложения по новому видению штатов структур уголовного розыска, общественного порядка, специальной милиции. Министр высказал надежду, что после обсуждения к концу декабря новое организационно-штатное построение МВД будет принято.

Накануне министр посетил Слонимский ГРОВД, Зельвенский РОВД, участок дорожной милиции Волковысского РОВД и стационарный пост ГАИ в Гродненском районе. Целью поездки было знакомство с работой и личным составом милицейских подразделений. Гродненщина стала первым регионом, куда Наумов приехал после назначения его 25 сентября на новую должность. Посещение этой области не было случайным. По словам министра, он считал и считает, что этот регион — один из стабильных в Беларуси, где предпринимаются результативные меры по наведению порядка.

Ася КУНИЦКАЯ

Восстановлен памятник повстанцам Калиновского

Недавно на военном полигоне недалеко от поселка Ружаны (Брестская область) состоялся митинг возле восстановленного памятника повстанцам, которые воевали за независимость Беларуси под знаменами Кастуся Калиновского.

В 1863 году на этом месте состоялась битва, в которой погибли повстанцы. Все 40 человек были похоронены в братской могиле. В 30-е годы на месте захоронения был установлен памятник.

Валентина КОЗЛОВИЧ

Спакойныя ВЫБАРЫ

У нядзелю, 15 кастрычніка, Слонім наведалі назіральнікі з Польшчы — Віктар Антанюк і Эўгеніуш Сіманюк, каб паглядзець, як у нас адбываюцца парламенцкія выбары.

Па словах замежных гасцей, у Беларусь яны прыбылі па ўласнаму жаданню. Іх прыехала дзесяць чалавек: адзін накіраваўся ў Мінск, сем — у Гродна і два засталіся ў Слоніме.

"Пад час нашага прыбывання на Гродзеншчыне, мы атрымалі магчымасць пабываць у тых месцах, выбарчых участках, дзе жадалі. І нідзе не заўважылі ніякіх парушэнняў", — адзначыў дэпутат Беластоцкага павятовага Савета Віктар Антанюк.

Па словах Эўгеніуша Сіманюка, дэпутата гарадскога Савета горада Бельск-Падляскі, выбары ў Слоніме праходзілі вельмі спакойна.

Вольга ШЫНКЕВІЧ



Фота Віталя Гіля

Віктар Антанюк і Эўгеніуш Сіманюк

АКЦИЯ В ПОДДЕРЖКУ БОЙКОТА

Примерно 3—4 тысячи человек приняли участие в митинге оппозиции в поддержку бойкота парламентских выборов, который прошел 14 октября перед зданием Национального академического Большого театра оперы и балета — на площади Парижской Коммуны.

Перед собравшимися выступили председатель Партии БНФ Винцук Вячорка, руководитель ОГП Анатолий Лебедько, заместитель председателя БНФ Вячеслав Сивчик, лидер "Маладога фронту" Павел Северинец. Вячеслав Сивчик призвал белорусских граждан не ходить на выборы. Он, в частности, сказал: "Именно потому, что сегодня в Беларуси нет никаких реальных условий для проведения свободных выборов, объединенная белорусская оппозиция не пойдет на эти выборы и призывает своих сторонников завтра не ходить на избирательные участки".

Кроме политиков, в акции приняли участие артисты. Выступили известный бард Змитер Бартосик, участники театра "Батлейка", показавшие пародию на нынешние белорусские власти.

Во время проведения митинга, прошедшего с 15.45 до 18.10, никаких инцидентов не произошло, однако присутствовало много переодетых в штатское сотрудников правоохранительных органов.

Геннадий БАРБАРИЧ



Фота IREX/ProMedia

Молодые люди жгут пригласительные билеты на выборы во время акции оппозиции 14 октября 2000 г. в Минске

Налогового инспектора задержали ЗА ВЫМОГАТЕЛЬСТВО

Предприниматели, торгующие на Центральном колхозном рынке Гомеля, задержали и доставили в отделение милиции налогового инспектора из инспекции Советского района Гомеля, которая вымогала у одной из них взятку.

Об этом 13 октября БелаПАН сообщили в Свободном профсоюзе предпринимателей Гомеля. Поскольку разбирательство в отделении сводилось к тому, что инспектора могут просто отпустить, предприниматели сообщили о данном факте в Управление Госкомитета финансовых расследований Беларуси по Гомельской области. Следователи данного ведомства сейчас проводят проверку изложенных в заявлении предпринимателей фактов, а также взяли объяснения и с налогового инспектора. Кроме того, между инспектором и предпринимательницей, у которой собственно и вымогались деньги, произошла потасовка, в ходе которой последней были нанесены ушибы. Эта женщина направлена в судмедэкспертизу для снятия побоев.

БелаПАН

У школьника найден оружейный склад

17-летний ученик оршанской школы, имеющий судимость, устроил оружейный склад в загородном доме своего отца в Дубровенском районе Витебской области. Об этом БелаПАН сообщили в пресс-центре МВД Беларуси.

Проверяя оперативную информацию, сотрудники Оршанского межрайонного отдела управления по Витебской области Комитета по организованной преступности и коррупции совместно с коллегами из Оршанского ГОВД провели обыск в этом доме и обнаружили там автомат ППШ, винтовку Мосина (все это оружие времен Великой Отечественной войны), а также 150 патронов калибра 7,62 мм.

Милиция выясняет происхождение и назначение арсенала.

Вячеслав БУДКЕВИЧ

Почти половина белорусов — ВЕРУЮЩИЕ

Около половины — 47 процентов — из более чем двух с половиной тысяч опрошенных социологами жителей Беларуси считают себя верующими.

Ученые Института социологии Национальной академии наук Беларуси проводили общенациональный социологический опрос в сентябре этого года среди граждан 18 лет и старше. 20 процентов опрошенных жителей республики не считают себя верующими. И каждый третий респондент — 33 процента — затруднился ответить на предложенный вопрос.

Отвечая на вопрос: "К какому вероисповеданию вы себя относите?" подавляющее большинство — 78 процентов — отнесли себя к православным, 9 процентов считают себя католиками и такое же количество (9 процентов) респондентов не ответили на вопрос. По 1 проценту опрошенных отнесли себя к протестантам и к иудеям. А два процента — к иному, реже встречаемому в Беларуси вероисповеданию.

БелаПАН

В Лиде праздновали 2000-летие христианства

В Лиде прошли торжества по поводу 2000-летия христианства.

Рядом с Михайловским кафедральным собором было освящено место, где в честь этого юбилея будет установлен памятный знак. Обряд освящения и праздничную литургию отслужил митрополит Минский и Слуцкий Филарет, патриарший экзарх всея Беларуси. Для участников торжеств в городском Доме культуры состоялся концерт духовной музыки.

Ася КУНИЦКАЯ

ГОНЧАРИКА ВНОВЬ ВЫБРАЛИ ПРЕДСЕДАТЕЛЕМ

Владимир Гончарик вновь избран председателем Федерации профсоюзов белорусской (ФПБ).

11 октября более 300 делегатов III съезда ФПБ единогласно проголосовали за его кандидатуру. Выборы проводились открытым голосованием на безальтернативной основе. Это происходило вопреки предсказаниям ряда наблюдателей о том, что нынешний съезд способен поставить под вопрос многолетнее пребывание Гончарика на посту руководителя ФПБ. Сам Владимир Гончарик, взявший слово по итогам голосования, заявил: "Я не держусь за кресло, но дорожу доверием".

Ирина ЛЕВШИНА

В Беларусь прибудет новый посол США

20 октября в Минск прибудет новый посол США в Беларуси Майкл Козак, сообщили БелаПАН в информационной службе посольства Соединенных Штатов.

Комитет по международным делам Сената США утвердил г-на Козака на должности 8 сентября, а 29 сентября он был приведен к присяге.

Майкл Козак является карьерным дипломатом, он работает в Государственном департаменте США с 1971 года. Родился в местечке Посадина (Калифорния) и закончил Калифорнийский университет в Беркли. Г-н Козак занимал должности первого заместителя юридического советника Госдепартамента США и первого заместителя секретаря Госдепартамента по межамериканским делам, а в последнее время возглавлял миссию, представляющую интересы США при посольстве Швейцарии на Кубе.

Алексей ЗНАТКЕВИЧ

Справочники о храмах Беларуси

В издательстве "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" готовятся к выходу энциклопедические справочники "Праваслаўныя храмы на Беларусі" и "Каталіцкія храмы на Беларусі".

Как сообщил БелаПАН главный редактор издательства Геннадий Пашков, эти многоцветные хорошо иллюстрированные издания тиражом в 3 тысячи экземпляров каждое, подготовленные старшим научным сотрудником Института искусствоведения, этнографии и фольклора Национальной академии наук Анатолием Кулагиным, почитатели национальной истории и культуры смогут приобрести уже в нынешнем году. Справочники выпускаются в соответствии с правительственным планом мероприятий по подготовке к встрече третьего тысячелетия и празднованию 2000-летия христианства в Беларуси. По словам Пашкова, в конце нынешнего года также планируется выход книги "Беларусь на мяжы тысячагоддзяў", которая является результатом работы большого коллектива ученых и сотрудников издательства — философов, историков и экономистов. Она дает общие сведения о стране — ее экономике, политике, истории и культуре.

Сейчас сотрудники издательства работают над энциклопедиями спорта, театра, юмора, автомобильных дорог, энциклопедическими справочниками "Жанчыны ў гісторыі Беларусі" и "Мысліцелі і асветнікі Беларусі".

Марат ГОРЕВОЙ

Рост потребительских цен за сентябрь

По итогам сентября 2000 года рост потребительских цен в Беларуси составил 6,8 процента.

Об этом сообщили БелаПАН в Министерстве статистики и анализа. Это самый высокий показатель инфляции после февраля 2000 года, когда цены увеличились на 9,3 процента. В августе инфляция составила 3,6 процента, что в 1,9 раза меньше, чем в сентябре.

За девять месяцев 2000 года потребительские цены в Беларуси выросли на 78,2 процента (за этот же период 1999 года — в 2,37 раза, в т.ч. в сентябре — на 12,1 процента).

Дмитрий ВЛАСОВ

РОССИЯ ЗАДОЛЖАЛА БЕЛАРУСИ

Беларусь ежегодно оказывает Российской Федерации услуги на сумму 850 миллионов долларов США, заявил Александр Лукашенко, выступая 12 октября перед депутатами Палаты представителей и членами Совета Республики Национального собрания Беларуси.

В такую сумму Лукашенко, в частности, оценил "базы, транзит и прочие, прочие услуги", оказываемые белорусской стороной России.

Еще 200 миллионов долларов США в год, по мнению президента, стоит будущее использование российской стороной строящейся под Ганцевичами (Брестская область) станции предупреждения о ракетном нападении. "За Байконур Россия платит 200 миллионов долларов в год, а чем отличается эта станция от Байконура?" — сказал Лукашенко. Поэтому, как выразился белорусский лидер, "не надо нас долбать за 200 миллионов, которые мы порой не вовремя выплачиваем за газ".

Помимо этого, заявил Лукашенко, и 100-тысячная белорусская армия содержится не только для защиты Беларуси, но и для "российских братьев", что, по его словам, также "стоит немалых денег". "Но мы эту бухгалтерию как братские государства не выпячиваем", — сказал Лукашенко.

Юрий ПОТЕМКИН

РОЖАЮТ МЕНЬШЕ

Годовое количество родов в Беларуси за последние 10 лет уменьшилось более чем на 40 тысяч.

Как сообщил 10 октября на пресс-конференции в Минске главный акушер-гинеколог Министерства здравоохранения Владимир Селява, если 15 лет назад в Беларуси рождалось более 160 тысяч детей в год, сейчас — всего 93 тысячи. Вместе с тем, 10—15 лет назад в республике ежегодно умирало около 3 тысяч детей до 1 года, а в последние 3 года — около 1 тысячи в год. Зато в 2-3 раза выросла детская инвалидность.

Среди проблем репродуктивной системы, влияющих на качество жизни женщины, Селява отметил проблему материнской смертности. В последние годы в Беларуси во время беременности умирает от 15 до 30 женщин в год. В республике живет около 5,3 миллиона женщин, из которых примерно 2,6 миллиона находятся в репродуктивном возрасте. Ежегодно в республике умирает около 60 тысяч женщин, 5 тысяч из которых находятся в репродуктивном возрасте.

Не менее важным вопросом, по мнению главного акушера-гинеколога, является патология заболеваний органов репродуктивной системы женщины. В системе Минздрава проводится около 600 тысяч операций в год, и треть из них делается на репродуктивных органах женщин.

В связи со всеми этими проблемами Министерство здравоохранения возобновляет диспансеризацию женского населения в репродуктивном возрасте. Все женщины, желающие иметь ребенка, будут наблюдаться совместно терапевтической, акушерской и гинекологической службами. По словам главного акушера-гинеколога, это наиболее эффективный путь улучшения здоровья населения.

Владимир Селява также отметил, что Министерство здравоохранения планирует провести ряд мероприятий под общим девизом "Здоровье женщины во все периоды жизни". Эта программа охватит также вопросы лечения бесплодия в браке.

БелаПАН

Газета Слонімская
19 — 25 кастрычніка, 2000г. № 43 (176)

на жыццёвых скрыжаваннях

АКВАРЭЛІ БАБІНАГА ЛЕТА

Аўтобус з Мінска адыходзіў пасля палудня. На пасадачнай пляцоўцы тоўпіўся народ. Маладжавая жанчына, якая сядзела побач са мной, некаму махала праз акно. Як я зразумела, яе праводзіў высокі сівы мужчына з дыпламатам. Ён стаяў і ўсміхаўся.

— Ішоў бы ўжо дадому, — ласкава паўшчувала, нібы мужчына на пляцоўцы мог пачуць. У голасе было столькі пяшчоты, што было па-добраму зайздросна, глядзячы на чужое шчасце.

Нарэшце аўтобус крануўся.

— У Ліду еду, да ўнучкі на вяселле, — паведаміла гаваркая жанчына. — Раней выбралася, бо трэба там дапамагчы прыгатавацца, а ён заўтра прыедзе.

— Вы такая маладая, а ўжо ўнучку замуж аддаяце! — шчыра здзівілася я.

— Ну, я яшчэ не зусім старая, — сціпла ўсміхнулася. — Ды я ж і сама замуж збіралася ў васемнаццаць гадочкаў. У васемнаццаць і дачку нарадзіла. А тая таксама ў дзеўках не засядзелася. Вось і выходзіць, што маладая.

— Вы неяк дзіўна сказалі: збіралася?

— Правільна, не выйшла, а менавіта збіралася. А здарылася так, як у той песні пяецца: яшчэ поле не аралі, а ўжо ўсходзіць жыта... Зацяжарыла я без шлюбу. Праўда, хлопец спачатку і згодны быў жаніцца. Занеслі заяву ў сельсавет, яго бацькі пабывалі ў нас на заручынах, і ўсе пачалі рыхтавацца да вяселля. Мне ўжо мама белую сукенку пашыла, вэлюм купілі. Я была на сёмым небе ад шчасця і на трэцім месяцы цяжарнасці. І калі пра шчасце было напісана на твары, дык пра цяжарнасць ведалі толькі каханы і самая блізкая сяброўка. Гэта цяпер ледзь не кожная трэцяя дзяўчына выходзіць замуж цяжарнай, а тады гэта была вялікая рэдкасць. У вёсцы такое лічылася ганьбай. Але нічога, думала, выйду замуж, а тады няхай гавораць, што хочуць. У дзіцяці будзе бацька, а гэта галоўнае.

Аднак атрымалася інакш. За тыдзень да вяселля жаніх перастаў з'яўляцца ў нашай хаце. Мама прыставала да мяне з роспытамі, а я нічога не ведала. Ды і што будзеш ведаць, калі жыў ён за дзесяць кіламетраў. Аднойчы вечарам да нас прыйшла мая сяброўка і неўпрыкмет міргнула мне, каб выйшла ў сені.

— Бяда, Манечка! — аглушыла яна мяне словамі. Твой Коля дзеўку мае ў суседняй вёсцы і ўсім кажа, што жаніцца з табой не будзе.

— Што вы тут шэпчацеся? — выглянула ў сені мама. —Чаго ты маўчыш, дзеўка? — страсянула мяне за плячо.

Я выбегла ў вечаровую цемень і, не разбіраючы дарогі, распырсквала халодныя восеньскія лужы. Нудна выў вецер, а мне здавалася, што гэта вые мая душа...

Сяброўка дагнала мяне, вярнула дадому. А ў хаце яна мусіла ўсё расказаць маёй маме, бо я праз слёзы і слова не магла вымавіць.

— Дакруцілася! — накінулася на мяне маці. — Праганю прэч, і жыві як хочаш. Бач, што вырабіла! І ўсё таіла, таіла, думала ніхто ніколі не даведаецца. Каб жа раней, то можна было б яшчэ паправіць.

— Што паправіць?! — узбунтаваўся бацька. — Я табе папраўлю! Акалечыць дачку хочаш?

Не ведаю, чым бы і закончылася тая калатнеча, бо ў хаце кожны дзень стаяў такі лямант. Мне ўжо і жыць не хацелася. А яшчэ гэта белая сукенка і вэлюм... Як папрок мне. Гляну — і слёзы душаць.

... Наляцела асенняя хмара і прытушыла фарбы бабінага лета. Паліў дождж. З прыдарожных кустоў аблятала лістота.

— Не ведаю, чым бы і закончылася, — у роздуме працягвала жанчына, — каб не прыехала з Мінска сястра майго таты. Выслухаўшы маміны папрокі і глянуўшы на мой спакутаваны твар, яна цвёрда сказала:


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

— Паедзем, Манечка, са мной. Не прападзём. І дзіцятка выгадуем, як народзіцца, і не будзеш ты штодзень слёзы ліць.

Цётка мая была старою дзеўкаю і жыла ў кватэры адна. У яе я і пасялілася. З ёй удзвюх выставілі маю Іначку. Зацягнулася душэўная рана, і пакуль жыла цётка, я не адчувала сябе адзінокай ці абдзеленай лёсам. Але аднойчы яна раптоўна памерла. Для мяне гэта быў удар, ад якога я доўга не магла адысці. І то сказаць: цётка дала мне прытулак, дапамагла выгадаваць дачку, набыць адукацыю. Гэта дзякуючы ёй я стала інжынерам. Працавала ў канструктарскім бюро. І вось з яе смерцю ў маім жыцці ўтварылася нейкая сцяна адзіноты. Дачка падрасла ўжо. У яе з'явіліся свае інтарэсы. Я засталася адна. Вось тады і ўзнікла нейкая балючая туга па сям'і. Уласна кажучы, я і не мела сапраўднай сям'і, дзе былі б муж, дзеці, пра якіх трэба было б клапаціцца, берагчы. Наадварот, пра мяне заўсёды клапацілася цётка.

І тут у нашым канструктарскім бюро з'явіўся мужчына гадоў пад сорак. За мяне крыху старэйшы, але вельмі відны, прыгожы. Пазнаёміліся, пачалі сустракацца. З ім я звязала свае кволыя надзеі на сямейнае шчасце.

Аднойчы вечарам ён пазваніў, што пайсці ў кіно сёння не зможа, бо дрэнна сябе адчувае.

— Што, можа зноў язва абвастрылася? — з трывогай спытала я.

— Так, — коратка адказаў ён, — патрэбна дастаць абляпіхавага масла. Гэта вельмі дапамагае.

Я пачала званіць ва ўсе аптэкі горада, да знаёмых. І толькі позна вечарам у адной з інстытуцкіх сябровак знайшла тое масла. Пакуль з'ездзіла на другі канец Мінска і забрала яго, а потым давезла ў новы мікраараён, дзе жыў дарагі мне чалавек, на двары была ледзь не поўнач. Пачыналася зіма, было холадна, а я ў лёгкіх боціках, сціснуўшы ў руцэ тую бутэлечку з маслам, кінулася ад таксі да яго пад'езда. Раптам пачула да болю знаёмы смех і жаночы голас. Бачу, з другога боку пад'езда ідзе каханы пад руку з нейкай маладзіцай. Гамоняць, смяюцца...

Я прыхінулася да сцяны дома, каб ён мяне не пазнаў і... больш нічога не помню. Ачуняла ў незнаёмай кватэры. Ляжала ў зале на канапе, а нейкі мужчына глядзеў тэлевізар. Пачуўшы, што я заварушылася, падышоў. На мяне зірнулі вочы немаладога стомленага чалавека.

— Вам ужо лепш? — з надзеяй спытаў ён.

— Так. А дзе я?

— Не хвалюйцеся, вас тут ніхто не пакрыўдзіць. Думаю, раніцай вы зможаце паехаць дадому. Калі ёсць блізкія, і яны будуць хвалявацца за вас, пазваніце.

Ён прынёс з прыхожай тэлефон, і я пазваніла дачцэ.

Не ведаю чаму, але было такое адчуванне, што ў тую ноч я нібы ў споведзі пабыла. Расказала гэтаму чалавеку ўсё сваё жыццё. Ён таксама не таіўся. Сказаў, што ўрач, што жыве адзін. Трапіў у аўтамабільную аварыю і вельмі пакалечыўся. Жонка знайшла другога. Забрала сына і з'ехала. У той вечар ён вяртаўся з працы, калі я непрытомная ляжала каля пад'езда. Прынёс у кватэру, аказаў медыцынскую дапамогу.

З першай жа сустрэчы мы зразумелі, што патрэбны адно аднаму. І неўзабаве распісаліся. Так і жывём. Калегі-хірургі зрабілі яму тры аперацыі, і цяпер ён амаль не кульгае. На старасці гадоў яшчэ і сына нарадзілі. Сёлета ён закончыў школу, паступіў у медыцынскі інстытут.

За акном распагодзілася, і такой прыгажосцю заззяла наваколле, калі аўтобус нырнуў у бярозавы гаёк, што міжволі захацелася ўсміхнуцца.

